пераходная форма выкарыстоўваўся шырокапрадстаўнічы гарадскі Грамадскі камітэт. Наладзіць гарадское жыццё ва ўмовах вайны і рэвалюцыі спрабавала гарадская дума. Аднак палітычныя барацьба і супярэчнасці не дазволілі стварыць стройную і ўстойлівую сістэму самакіравання. Новыя органы не паспелі умацавацца. Адзіным органам гарадскога самакіравання сталі Саветы пад жорсткім кантролем партыі бальшавікоў.

Спіс літаратуры


1. Витебский листок. 1916. 3 мая.
2. Известия Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов. 1917. 21 мая.
3. Витебский листок. 1916. 3 мая.
4. Известия Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов. 1917.
5. Там жа. 18 мая.
6. Там жа. 21 мая.
7. Там жа. 17 июня.
8. Там жа. 20 июня; 12 сентября.


## КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ Ў 1920-я ГАДЫ


*Т.В. Андруцкая*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Краязнаўчы рух у 20-я гады ХХ стагоддзя разгарнуўся па ўсёй краіне. Гэты перыяд характэрызуецца павелічэннем колькасці археалагічных даследванняў, утварэннем краязнаўчых таварыстваў і гурткоў, адкрыццём і рэарганізацыяй музеяў. Была наладжана сувязь паміж краязнаўчымі таварыствамі, адбывалася знаёмства з вынікамі іх дзейнасці. Краязнаўчыя арганізацыі хутка раслі. На сённяшні дзень сістэматызацыя назапашаных у 1920-я гады ведаў, вывучэнне выпрацаваных методык з’яўляюцца надзвычай актуальнымі.

Мэта працы – ахарактарызаваць краязнаўчы рух у Віцебску ў 20-я гады ХХ стагоддзя.

**Матэрыял і метады.** Работа грунтуецца на дакументах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. У даследаванні скарыстаны агульнагістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На мяжы ХІХ–ХХ ст. Віцебск з’яўляўся буйным краязнаўчым цэнтрам. Яшчэ ў канцы ХІХ ст. у Віцебку выказваліся думкі пра ўтварэнне Археалагічнага таварыства для вывучэння Віцебкага края. У 1909 г. была ўтворана Віцебская вучоная архіўная камісія, якая займалася аховай помнікаў даўніны, вяла археалагічныя раскопкі, выдавала навуковыя працы па гісторыі, геаграфіі, археалогіі і этнаграфіі Віцебшчыны. Былі ўтвораны архіў, бібліятэка і музей. Па ініцыятыве камісіі было створана Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Камісія праіснавала да 1919 г.

У студзені 1920 г. ўзнікла Камісія па ахове гістарычных помнікаў. Вынікам яе дзейнасці стала апісанне помнікаў архітэктуры, утварэнне Губернскага гісторыка-археалагічнага музея.

Некалькі год пры Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута існаваў гурток, а потым этнаграфічная камісія, якія займаліся зборам, вывучэннем і выданне матэрыялаў па матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Репозиторий ВГУ

На гэтым дзейнасць віцебскіх краязнаўцаў не спынілася, у 1924 г. у Віцебску было створана акруговае краязнаўчае таварыства (ВАКТ). Быў распрацаваны яго статут, у якім вызначаны асноўныя накірункі дзейнасці. Яно павінна было садзейнічаць вывучэнню роднага края, публікацыі даследаванняў. Асноўнымі накірункамі дзейнасці тавырыства сталі: вывучэнне матэрыяльнай і духоўнай культуры краю, даследаванне асаблівасцей мясцовай гаворкі, вывучэнне мастацкай культуры, утварэнне архіва, музея, бібліятэкі.

Вынікі дзейнасці краязнаўчага таварыства праявіліся ў арганізацыі і правядзенні краязнаўчых канферэнцый у 1925 і 1926 гг. На іх былі заслуханы даклады, звязаныя з рознымі накірункамі дзейнасці членаў таварыства.

Віцебскае краязнаўчае таварыства здолела за кароткі тэрмін актывізаваць дзейнасць членаў арганізацыі ў розных галінах вывучэння гісторыі Віцебшчыны, наладзіць сувязі з архівам, музеям, цэнтральнымі органамі кіраўніцтва краязначых арганізацый (Інбелкульт, Цэнтральнае бюро краязнаўства Беларусі). Пры таварыстве былі ўтвораны секцыі: культурна-гістарычная, мастацкая, беларусазнаўства, яўрэйская нацыянальная, этнаграфічная, эканамічная [1, арк. 5].

Дзейнасць таварыства не абмяжовалася вывучэннем толькі Віцебска. Яна ахапіла і раёны. На 1926 г. тавырыства ўтварыла 12 раённых аддзяленняў і гурткоў. Так, былі ўтвораны Высачанскае, Лёзненскае, Сенненскае, Чашніцкае, Бешанковіцкае, Гарадоцкае аддзяленні. Да ўдзелу ў вывучэнні роднага краю прыцягваліся і ўстановы адукацыі: Віцебскі дзяржаўны ветэрынарны інстытут, Мастацкі, Педагагічны тэхнікумы і шэраг іншых [2, арк. 164].

Дзякуючы дзейнасці таварыства былі апублікаваны кнігі: “Беларуская архітэктура” і “Віцебскі краёвы слоўнік” М.І. Каспяровіча, два тамы зборніка артыкулаў “Віцебшчына” і іншыя выданні [4, с. 32].

Краязнаўчымі даследваннямі займаліся не толькі ВАКТ і яго структурныя падраздзяленні, але і музеі. Сваю працу па даследаванні Віцебшчыны праводзіў губернскі музей. У 1924 г. была прынята пастанова аб аб’яднанні ўсіх віцебскіх музеяў у адзіны – Віцебскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага музея. Музейныя супрацоўнікі займаліся зборам, сістэматызацыяй і вывучэннем прадметаў старажытнасці і мастацтва, папулярызацыяй вынікаў свёй працы, распаўсюджаннем іх сярод мясцовага насельніцтва [3, арк. 103].

У 1927 г. ўзмацніліся адмоўныя тэндэнцыі ў развіцці краязнаўчага руху на Віцебшчыне. Гэта было звязана са зменамі ў палітыцы дзяржавы: зменшылася колькасць публікацый, звузілася кола тэм, вывучаемых краязнаўцамі. У сувязі з узмацненнем ідэалагічнага дыктату, асноўнымі тэмамі сталі тыя, якія раскрывалі сутнасць падзей паслярэвалюцыйнага перыяду. Дзейнасць музея стала абмяжоўвацца сістэматызацыяй музейных прадметаў і прапагандай сярод насельніцва пануючай ідэалогіі.

**Заключэнне.** 20-я гады XX стагоддзя сталі новым этапам у развіцці краязнаўства Віцебшчыны. Дзякуючы дзейнасці таварыстваў у Віцебску вялася навукова-даследчая работа. Распрацоўваліся тэмы па гісторыі, культуры, этнаграфіі, геаграфіі Віцебшчыны, выдаваліся навуковыя працы, друкаваліся артыкулы ў часопісах і газетах. У краязнаўчым руху актыўна ўдзельнічалі музеі, якія вялі працу па збіранні і вывучэнні, сістэматызацыі і папулярызацыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны.

Разам з тым існавалі пэўныя праблемы, якія к канцу 1920-х гадоў абвастрыліся: недахоп фінансавання, актыўных удзельнікаў. Пастаўленыя Віцебскім краязнаўчым таварыствам мэты не былі ў поўнай меры дасягнуты з-за змен у дзяржаўнай палітыцы.



Рэпазіторый ВДУ

Спіс літаратуры
1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ), ф. 170, воп. 1, спр. 51.
2. ДАВВ, ф. 1947, воп.1, спр. 33.
3. ДАВВ, ф. 1947, воп.1, спр. 11.
4. Прадзеіна, А. Абуджаць гістарычную рамантыку / А. Прадзеіна // Беларуская мінуўшчына. – 1998. – № 1. – С. 30–32.

## ДАБРАЧЫННЫЯ ЯЎРЭЙСКІЯ АБ'ЯДНАННІ БРАСЛАВА Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*Г.Х. Базарэвіч*
*Гісторыка-краязнаўчы музей г. Браслава*

Цягам стагоддзяў фарміраваўся поліэтнічны склад насельніцтва мястэчак, што ў значнай ступені паўплывала не толькі на відавочныя культурныя адрозненні паміж яго прадстаўнікамі, але і на фарміраванне адмысловай грамадска-палітычнай сістэмы. Яўрэйская этнічная супольнасць пад уздзеяннем знешніх і ўнутраных умоў вымушана была ствараць рознага накірунку аб'яднанні, якія адпавядалі бы культурным, грамадскім і эканамічным інтарэсам супольнасці. Адным з такіх праяўленняў з'яўляецца стварэнне дабрачынных яўрэйскіх аб'яднанняў і арганізацый.

Мэтай даследвання з'яўляецца вывучэнне структуры і накірункаў дзейнасці дабрачынных аб'яднанняў на прыкладзе браслаўскай арганізацыі дапамогі хворым яўрэям "Бікур Холім".

**Матэрыял і метады.** Крыніцай даследавання з'яўляюцца дакументы Каўнаскага павятовага архіва: ліставанне з ковенскім губернатарам і праект "Устава" аб'яднання. Аналіз гэтых матэрыялаў дазваляе зрабіць высновы аб сферы дзейнасці, якую ахоплівала аб'яднанне, яе функцыях і структуры. Успаміны, што захоўваюцца ў браслаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі, таксама даюць уяўленне аб дзейнасці іншых суполак, што мелі на мэце дабрачыннасць і ўзаемадапамогу. Выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Класавы і нацыянальны прыгнет у Расіі прывёў да таго, што ў канцы XIX ст. ад 25 да 38 % яўрэяў у шэрагу гарадоў і мястэчак Беларусі жыло за кошт дабрачыннасці, а шматлікія (у асноўным яўрэйская бедната), былі вымушаны эміграваць у ЗША і іншыя краіны. Толькі з 1881 па 1906 г. з царскай Расіі за мяжу з'ехала 1 236 161 яўрэяў. За 20 гадоў (1897–1917 гг.) з Віленскай і Магілёўскай губерній эмігравала па 53 тысячы, з Віцебскай – 47 тысяч, Гродзенкай – 73 тысячы, Мінскай – 91 тысяча [1, с. 62–63].

У канцы XIX ст. Браслаў – мястэчка Ковенскай губерніі, у якім звыш за 80% насельніцтва складалі яўрэі [4, с. 662]. Жыхары Браслава тройчы звярталіся да Ковенскага губернатара з прашэннем зацвердзіць праект устава, які прадугледжваў стварэнне аб'яднання дапамогі бедным і хворым яўрэям. Першы выяўлены пісьмовы зварот ад 18 жніўня 1899 г. знаходзіцца ў Каўнаскім павятовым архіве. У дакуменце апісваецца цяжкі стан ніжэйшых слаёў насельніцтва. Паведамляецца пра тое, што становішча некаторых хворых не дазваляе запрасіць лекара дамоў і часта людзі лечацца самі, што вядзе да працяглай хваробы. Такім чынам хворы абцяжарвае сваё сямейства [2, арк. 1]. Мэта зварота – атрымаць дазвол на стварэнне аб'яднання "Бікур Холім",



Рэпазіторый ВГУ